Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

Исторический факультет

Институт истории Национальной академии наук Беларуси

# 1917 ГОД В ИСТОРИЧЕСКИХ СУДЬБАХ НАРОДОВ БЕЛАРУСИ

*Материалы Международной научно-теоретической конференции*

*г. Минск, 22 декабря 2017 г.*

Минск
БГПУ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
Т936

Печатается по решению Совета исторического факультета БГПУ

Р е д к о л л е г и я:
кандидат исторических наук, доцент *А. В. Касович (отв. ред.);*
кандидат исторических наук, доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат исторических наук, доцент *А. А. Корзюк*

Р е ц е н з е н т ы:
доктор исторических наук, профессор *А. П. Житко;*
доктор исторических наук, профессор *А. М. Лютый*

Т936 **1917 год** в исторических судьбах народов Беларуси : материалы Международной научно-теоретической конференции, г. Минск, 22 декабря 2017 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2017. – 252 с.
ISBN 978-985-541-414-9.

В сборнике представлены материалы исследований ученых Беларуси, России, Казахстана, Туркменистана, студентов, магистрантов, учащихся учреждений общего среднего образования, посвященные 100-летию Октябрьской революции.

Адресуется преподавателям, магистрантам и студентам вузов.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-541-414-9**

© Оформление. БГПУ, 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ДА ПАСТАНОЎКІ ПРАБЛЕМЫ ГЕНЕЗІСУ КАПІТАЛІЗМУ Ў БЕЛАРУСІ

***Люты А. М.,*** *доктар гістарычных навук, прафесар, БДПУ, г. Мінск*
***Касовіч А. В.,*** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт, БДПУ, г. Мінск*

Даследаванне генезісу капіталізму з’яўляецца адной з актуальных і да канца нявырашаных задач гістарычнай навукі, нягледзячы на значную колькасць прац гісторыкаў і эканамістаў па гэтай тэме. Указаная праблема ўключае шэраг агульна-тэарэтычных і канкрэтна-гістарычных пытанняў, звязаных з асаблівасцямі развіцця таго ці іншага рэгіёну.

У другой палове XVIII – першай палове XIX ст. у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі зараджаюцца і актывізуюцца працэсы, што абумовілі ў далейшым эвалюцыю новых буржуазных адносін, якія прыйшлі на змену аджыўшых феадальна-прыгонніцкіх. Прапануемая праца дэманструе даследаванне вытокаў новых сувязяў элементаў грамадства, змены гэтых адносна стабільных да таго элементаў у напрамку стаць «іншымі», узнікненне новай арганізацыйнай грамадскай сістэмы з мэтай падпарадкавання ўсіх частак грамадства і стварэння не маючых месца ў ёй новых органаў кіравання. Гэтыя працэсы адбываліся ў Беларусі ў перыяд разлажэння феадальна-прыгонніцкіх адносін і ўзнікнення якасна новых, капіталістычных форм і катэгорый.

Праблема генезісу капіталізму заўсёды была асабліва важкай у гістарычнай навуцы. Даследчыкі справядліва заўважаюць, што яе навукова-метадалагічная і тэарэтыка-палітычная актуальнасць набыла пасля Другой сусветнай вайны сапраўды «другое дыхание». Гэта тлумачыцца крахам сусветнай каланіяльнай сістэмы, надзённымі пытаннямі «выбару шляху» краінамі, якія знаходзяцца ў стадыі развіцця, трансфармацыяй капіталізму і ўмацненнем інтэграцыйных працэсаў у сусветным грамадскім развіцці [1].

Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё СССР у 20–30-х гг. вызначалася працэсамі, якія адыходзілі ў мінулае. Невыпадкова ў сучаснай публіцыстыцы пры вызначэнні ладу пасля 30-х гг. з’яўляюцца такія азначэнні сацыялізму, як «дзяржаўны», «ранні», «феадальны» і г. д. [2]. Аб’ектыўнай асновай такога роду разважанняў з’яўляюцца ўзровень і тэмпы развіцця капіталізму ў Расіі, асабліва ў нацыянальных раёнах; павольнае яго развіццё ў дарэформенны перыяд і высокія тэмпы ў другой палове XIX ст. Але ці дастаткова было менш чым паўвекавога фармацыйнага развіцця грамадства, каб выкарыстаць усе магчымасці капіталізму? Відаць, не. Адсюль тыя асаблівасці, перагібы пераходных перыядаў ад капіталізму да сацыялізму, а зараз – ад сацыялізму да капіталізму, да якіх у апошні час прыкавана ўвага не толькі гісторыкаў, эканамістаў, але і шырокай грамадскасці.

Рамкі працэсу абмежаваны храналагічна: другая палова XVIII – першая палова XIX ст. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў пераходны перыяд даволі поўна адлюстравана, аднак не заўсёды паступальна, а часам зігзагападобна, нават з вяртаннем да пройдзеных этапаў, але заўсёды неабарачальна – ад феадалізму да капіталізму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Айчынныя і замежныя гісторыкі ўжо некалькі дзесяцігоддзяў вядуць дыскусію па пытаннях пераходу ад феадалізму да капіталізму, аб месцы таварнай вытворчасці і яе ролі пры феадалізме і ў пераходны перыяд, аб характары прычын і сацыяльна-экнамічным змесце «другога выдання прыгонніцтва», аб сацыяльнай структуры і месцы ў працэсе генезісу капіталізму пасэсіённай і вотчыннай мануфактур, тэндэнцыях развіцця грашовай рэнты ў XVI–XVII стст., формах першапачатковага накаплення і г. д.

У гістарычнай навуцы існуе некалькі пунктаў гледжання пра час узнікнення капіталістычнага ўкладу ў Расіі: XV–XVI стст., XVII ст., першая чвэрць XVIII ст., другая палова XVIII ст. і нават першая палова XIX ст. [3]. Заўважым, што пры вызначэнні часу пачатку генезісу капіталізму неабходна ўлічваць не толькі заканамернасці гэтага сацыяльна-эканамічнага працэсу, але і яго асаблівасці ў рэгіёнах. Напэўна, вызначаць храналагічныя рамкі ўказанага працэсу неабходна не ў цэлым па Расіі ці Рэчы Паспалітай, а для асобных сацыяльна-эканамічных рэгіёнаў. Нават у рамках рэгіёну капіталізм не адразу закранаў усе галіны эканомікі і сацыяльнага жыцця. Таму пытанне пра пачатак пераходнага перыяду, на наш погляд, павінна вызначацца неабарачальнасцю гэтага працэсу. Да таго часу, пакуль не надыходзіць разлажэнне і крызіс папярэдняга ладу, не ўзнікае неабходнасць і ў новых сацыяльна-эканамічных адносінах.

У развіцці працэсу капіталізму можна вылучыць два этапы: пераўтварэнне натуральнай гаспадаркі феадальнай эпохі ў таварную як перадумову зараджэння капіталізму; пераўтварэнне таварнай гаспадаркі ў капіталістычную, калі таварам становіцца не толькі зробленая на рынак прадукцыя, але і рабочая сіла. Як неабарачальны працэс такая тэндэнцыя выразна прасочваецца ў Беларусі ў другой палове XVIII ст.

Храналагічныя рамкі даследавання намі не прывязваюцца да палітычных падзей канца XVII ст. – далучэння Беларусі да Расіі. Аднак адмаўляць значэнне гэтай падзеі на тэмпы і характар капіталізму таксама нельга. Менавіта аналіз сацыяльна-эканамічнага жыцця ў Беларусі пачынаецца з другой паловы XVII ст., калі Беларусь яшчэ ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, і завяршаецца канцом 50-х гг. XIX ст., хаця працэс генезісу капіталізму працягваўся і ў парэформенны час, але там ён мае сваю спецыфіку, асаблівыя праблемы, якія могуць стаць прадметам самастойнага даследавання.

Другая палова XVIII – першая палова XIX ст. – гэта перыяд, калі ў параўнальна кароткі гістарычны прамежак часу адбываюцца прыкметныя змяненні эканамічных адносін і супярэчнасцей, сацыяльных структур і дзяржаўнасці феадальнага тыпу, нарэшце ідзе працэс хуткіх змяненняў па ўсёй лініі традыцыйных форм і норм мыслення [4]. Станаўленне і паступовы пераход ад феадальных да фарміравання буржуазных адносін працякалі як сацыяльна-эканамічны працэс у рамках папярэдняга ладу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гісторыкам неабходна вырашыць наступныя задачы: ахарактарызаваць сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы зараджэння буржуазных адносін у Беларусі; паказаць месца і ролю таварнай вытворчасці ў перыяд позняга феадалізму; прааналізаваць прычыны і сацыяльна-эканамічны змест «другога выдання прыгонніцтва», а таксама працэс разлажэння і крызісу феадалізму; асвятліць пытанне аб сацыяльнай структуры і месцы ў працэсе генезісу капіталізму дробнай таварнай вытворчасці, вотчыннай і купецкай мануфактур; даследаваць тэндэнцыі развіцця розных форм феадальнай рэнты; раскрыць формы першапачатковага назапашвання капіталу ў Беларусі, іх асаблівасці і ўплыў на тэмпы генезісу капіталізму; паказаць ролю гандлю, транспарту і фінансаў на фарміраванне элементаў і новых структур буржуазнага грамадства; разгледзець пытанне аб суадносінах прыгоннай і вольнанаёмнай працы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы; прасачыць эвалюцыю саслоўяў і сацыяльных груп насельніцтва Беларусі і фарміраванне класаў буржуазнага грамадства; вызначыць тэмпы і ўзровень працэсу генезісу капіталізму [5, с. 4–5].

***Літаратура***


1. Чистозвонов, А. Н. Генезис капитализма: Проблемы методологии / А. Н. Чистозвонов. – М., 1985. С. 4.
2. Бордюгов, Г. Время трудных вопросов / Г. Бордюгов, В. Козлов // Правда. 1988. 30 сентяб.
3. Индова, Е. И. Проблема буржуазного расслоения крестьянства в период позднего феодализма в России / Е. И. Индова, А. А. Преображенский, Ю. А. Тихонов // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. Рига, 1963; Яны ж. Буржуазное расслоение крестьянства в России XVII–XVIII вв. // История СССР. 1962. N 3; Яцунский В. К. Еще к вопросу о возникновении капиталистического расслоения земледельческого крестьянства в дореформенной России // История СССР. 1963. № 1; Они же. Основные этапы генезиса капитализма в России // История СССР. 1958. № 5; Булыгин И. А., Индова Е. И.. Преображенский А. А. Начальный этап генезиса капитализма в России // Вопросы истории. 1966. № 10; Павленко Н. И. Спорные вопросы генезиса капитализма в России: Материалы всесоюз. дискуссии. М., 1969; Ковальченко И. Д., Милов Я В. Всероссийский аграрный рынок XVIII – начало XX века. М.; 1974; Рындзюнский П. Г. Утверждение капитализма в России. М., 1980; Миронов Б. Н. Внутренний рынок России во второй половине XVIII – первой половине XIX в. Л., 1981; Ковальченко И. Д. Методы исторического исследования. М. 1987; Феодализм в России. М., 1987.
4. Феодализм в России. – М., 1987.
5. Люты, А. М. Сацыяльна-эканамічнае развіцце Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя : манаграфія. – Мінск, 2004. – 322 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЧИСЛЕННОСТЬ ГОРОДОВ И МЕСТЕЧЕК НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ XVIII – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ XIX в.

***Лобанок А. К.,*** *кандидат исторических наук, доцент, «МИТСО», г. Минск*
***Лютый А. М.,*** *доктор исторических наук, профессор, БГПУ, г. Минск*

Для определения числа городских поселений необходимо выделить признаки, по которым населенный пункт можно отнести к поселению городского типа. В научной литературе существуют различные точки зрения по этому вопросу. А. М. Карпачев, исходя из численности населения, учитывая при этом социальный состав населения поселений (наличие купцов, мещан-ремесленников), относит к числу городских поселений в Беларуси в конце XVIII в. 39 городов и 350 местечек [1]. П. Г. Рындзюнский, основываясь на том факте, что большинство местечек Беларуси находилось в частной собственности помещиков, власть которых заменяла городские учреждения, не причисляет местечки к городским поселениям, а относит сюда только 39 белорусских городов [2]. В. К. Яцунский отмечает, что понятие «город» в эпоху феодализма не было в России одним и тем же ни во времени, ни в пространстве, то есть его сущность изменялась в разные периоды и была различной в разных регионах [3].

При изучении вопроса о количестве городов в белорусских губерниях в конце XVIII – первой половине XIX в. нами учитывалась административная принадлежность поселения. К городам отнесены поселения, фигурирующие в официальных документах того времени в качестве губернских, уездных или заштатных городов. Однако частые административно-территориальные изменения в Беларуси в конце XVIII – начале XIX в. затрудняют точное определение категории многих поселений. Местечки рассматривались в качестве особого типа поселений, часть из которых вполне можно отнести к категории «город».

По указу сената от 23 октября 1772 г. после первого раздела Речи Посполитой восточная часть Беларуси вошла в состав Псковской и Могилевской губерний. В Псковскую губ. входили Полоцкая и Витебская провинции, в Могилевскую – Могилевская, Оршанская, Мстиславская и Рогачевская [4]. В 1776 г. белорусские уезды были выделены из Псковской губ. и из них была образована Полоцкая губ. (губернский город Полоцк), которая в 1778 г. была переименована в Полоцкое наместничество. После второго раздела Речи Посполитой и воссоединения с Россией центральной части Беларуси указом от 23 апреля 1773 г. было образовано Минское наместничество с центром в Минске. На территории Беларуси после третьего раздела Речи Посполитой была образована в декабре 1795 г. Слонимская губ. (8 уездов). Браславский и Ошмянский уезды были включены в состав Виленской губ [5]. По административной реформе 1796 г. наместничества были переименованы в губернии, однако их территории полностью совпадали. Полоцкая и Могилевская губернии были объединены в Белорусскую губ. (губернский город Витебск). К Минской губ. от



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ